

# Інтэрпрэтацыя музычнага фальклору:

Апошнім часам Беларусь усе больш і больш прыцягвае да сябе ўвагу з боку сусветнага грамадства ў галіне мастацтва. Такія калектывы, як этнатрыо "Троіца", працуюць на высокім еўрапейскім узроўні, адраджаюць старадаўнія культурныя традыцыі, шырока прапагандуюць беларускае мастацтва далёка за мяжой. Больш таго, іх творчасць выконвае і такую вельмі значную выхаваўчую функцыю, як фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і музычнага густу шырокага кола моладзі, якая складае іх слухацкую аўдыторыю. Прыемна, што сярод людзей, якія займаюцца такой карыснай справай, і выкладчык Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка Іван Кірчук.

Этнатрыо "Троіца" (кіраўнік гурту — мультыінструменталіст І.Кірчук) заснавана ў 1995 годзе. Назва калектыву паходзіць ад паняцця шматзначнага і аб'ёмнага, адно з тлумачэнняў якога – траістая музыка (традыцыя ансамблевага музіцыравання ў Беларусі). Свой стыль калектыў пазначыў як folk-fusion (fusion з англ. сумесь) – сінтэз аўтэнтычнага фальклору з сучаснымі музычнымі формамі (рок, блюз, джаз, кантры і інш.). Больш абагульнена напрамак, у якім працуе калектыў, вызначаюць як world music (з англ. – сусветная музыка) – сучаснае прачытанне народнай спадчыны з мінімальным змяненнем першакрыніцы. Як адзначае музычны крытык Дз.Мухавец, "такі кірунак сёння надзвычай папулярны ва ўсім свеце і значна пашырае аўдыторыю пераважна маладых людзей за кошт адкрыцця ім тых "экзатычных" твораў, якія жыхары тэхнакратычнага грамадства не заўважаюць літаральна побач з сабой"[1].

Абраную стылістыку гурт тлумачыць наступным чынам: песні ў аўтэнтычным выглядзе сёння не цікавяць моладзь, і таму "Троіца" імкнецца заключаць беларускую музычную спадчыну ў формы, зразумелыя слухачу, вырашаць кампазіцыі ў духу часу. Такім чынам, інтэрпрэтуючы беларускі музычны фальклор, калектыў выкарыстоўвае інструменты народаў свету, а таксама сродкі выразнасці і інтанацыі, нехарактэрныя для традыцыйнага мастацтва Беларусі.

Аўтэнтыку гурт вывучае вельмі скурпулёзна не толькі каб зрабіць аранжыроўку, але і для захавання першакрыніцы, таму што экспедыцыйныя запісы фальклору знаходзяцца не на сучасных носьбітах і існуе пагроза з цягам часу ўвогуле іх згубіць. Матэрыяламі для працы паслужылі:

– уласныя архівы экспедыцый І.Кірчука ў перыяд 1984–1996 гг. па розных рэгіёнах нашай краіны;

– архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі;

– архіў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі;

– прыватныя калекцыі.

Калектыў распрацоўвае найбольш старажытныя песенныя пласты. Яго рэпертуар складае абрадавы (каляндарны, сямейны) і лірычны фальклор. Пераважная колькасць песень – жаночыя, таму што менавіта жанчыны прымалі непасрэдны ўдзел ва ўсіх абрадах (вяселлях, радзінах і г.д.). Мужчынскіх песень зафіксавана значна менш.

Цікавасць да калектыву, як лічыць лідэр гурту, абумоўлена тым, што народная песня нясе ў сабе нейкую старажытную зашыфраваную інфармацыю, якая, надаючы выкананню вельмі моцную энергетыку, быццам бы пераносіць слухача ў бездань часу. Больш таго, музыканты выкарыстоўваюць шмат экзатычных акустычных інструментаў і працуюць нестандартна: кожная новая праграма і новая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Этнатрыо «Троіца»



кампазіцыя не падобная на папярэднюю. Музычны матэрыял вырашаецца цікава як стылістычна, так і па інструментальнаму складу і сродках выразнасці. Напрыклад, кампазіцыі "Добрэ тому"[1] і "Пожня"[1] маюць полірытмічную фактуру, а для кампазіцыі "Прыкракнула"[1] характэрна невялікае спазненне перкусій, што надае ёй непаўторныя фарбы.

Кожная песня падаецца ў тым ці іншым стылі ў залежнасці ад характару і складу першакрыніцы. Ансамбль не робіць акцэнт толькі на музыцы, тэксце ці іншых сродках, а трактуе твор як нешта цэласнае, комплекснае, непадзельнае, захоўваючы мелодыку, рытміку, дыханне, манеру спеваў, тэкст, дыялект.

Над аранжыроўкамі працуе звычайна ўвесь калектыў "Троіцы": новы матэрыял спачатку праслухоўваецца, потым абмяркоўваецца і шукаецца варыянт падачы. Уся праца ідзе толькі з аўдыёзапісамі, і таму музыканты вельмі добра ведаюць усе нюансы, характэрныя для песень. Асноўная мелодыя выкарыстоўваецца адпаведна першакрыніцы, а вакальныя падгалоскі маюць рысы імправізацыйнасці. Працуючы над кампазіцыямі, гурт імкнецца пранікнуць у дух беларускай народнай песні. Так, песня "Русальная"[3] спакойная, меладычная, таму музыканты не выкарыстоўвалі напорысты хардрокавы рытм, а зрабілі аранжыроўку згодна характару першакрыніцы. Этнатрыо шмат эксперыментуе: пры працы над "Рэчанькай"[3] былі задзейнічаны ўсе магчымыя 16 каналаў запісу з рознымі інструментамі і шматлікай колькасцю вакальных партый, што ў канцэртных умовах ажыццявіць немагчыма. Калектыў не заўсёды імкнецца да значнай перапрацоўкі музычнага матэрыялу, а зыходзіць з самой песні. Напрыклад, кампазіцыя "Пожня"[1] набліжана да экспедыцыйнага запісу. А вось кампазіцыя "Ой, бору мой"[1] ёсць прыклад максімальнага эксперымента: твор увабраў у сябе тры песні вясельнай тэматыкі ("Ой, бору мой", "Не забывайся, Іванька, што табе мамачка казала", "Гэй, Лялё"). Што тычыцца інструментальнага суправаджэння, то канцэртныя праграмы гурту ў асноўным складаюць творы, якія спяваюцца, як і ў аўтэнтыцы, без акампанементу. Але ёсць і такія, што добра кладуцца на інструментальнае суправаджэнне, набываюць дзякуючы гэтаму шмат цікавых фарбаў. Гурт таксама перапрацоўвае свае старыя кампазіцыі, надаючы ім новае гучанне. Аднак ёсць прыклады і кардынальнай перапрацоўкі аранжыровак.



**ГУРЧАНКА Алеся Іванаўна** – аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

У аснове працы калектыву заўсёды ляжаць беларускія музыка і тэкст, арыгінальная мелодыя. Але, як гаворыць І.Кірчук, каб раскрыць дух першакрыніцы, неабходна мець гук, тэмбр належнага ўзроўню; належны настрой прыходзіць праз гучанне інструмента. Ансамбль актыўна і досыць смела эксперыментуе, выкарыстоўваючы самыя нечаканыя інструменты, якія знаходзяцца ў калекцыі І.Кірчука. Гурт мае ўвесь комплекс беларускага традыцыйнага музычнага інструментарыя: жалейкі, дудкі, чарот, акарыны, смык, домры, цымбалы, ліру, званочкі. Але побач з імі зна-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ходзяцца 6- і 12-струнныя гітары, сучасныя эстрадныя перкусіі і традыцыйныя інструменты іншых краін свету. Такое нечаканае і даволі цікавае тэмбравае спалучэнне лідэр гурту аргументуе тым, што фальклорныя музычныя інструменты розных краін свету вырабляюцца з адных і тых жа матэрыялаў (дрэва, гліны і г.д.) і маюць толькі нейкія тэмбравыя асаблівасці. Таму "Троіца" не абмяжоўвае сябе толькі беларускімі інструментамі.

Цікавасць ансамбля да экзатычных інструментаў знаходзіцца ў рэчышчы сучаснай тэндэнцыі аб'яднання ў межах аднаго калектыву культур некалькіх краін. У адносінах да ЗША гэта ўжо адзначыў музыказнаўца В.Конен: "Стварэнне "інтэрнацыянальных" па свайму складу ансамбляў з надзвычайна шырокім спектрам выканальніцкіх сродкаў і эстэтычных арыентацый, якія ахопліваюць некалькі самых розных і ў мінулым вельмі адна ад адной далёкіх мастацкіх культур, становіцца ўсё больш тыповым для сучаснага музычнага жыцця Злучаных Штатаў"[2]. Побач з прыхільнікамі творчасці "Троіцы", напэўна, ёсць і тыя, хто лічыць немагчымым выкарыстанне такога інструментальнага складу. Аднак, па-першае, як адзначае І.Кірчук, кожны мае права на эксперымент, таму што і народ заўсёды нешта шукаў. Па-другое, у аснове традыцыйных інструментаў і музыкі розных народаў ляжаць агульныя глыбінныя вытокі, таму такое спалучэнне нельга назваць выпадковым. Па-трэцяе, творца мае права на сваю інтэрпрэтацыю, калі ў яго ёсць прыхільнікі і ён запатрабаваны сённяшнім слухачом.



Сцэнічны рух падчас выступлення этнатрыо "Троіца" амаль што адсутнічае, калі не лічыць лазернае асвятленне, слайды і змену інструментаў на працягу ўсяго канцэрта. Музыканты планавалі выходзіць на сцэну па аднаму або пакідаць сярод праграмы аднаго з музыкантаў для сольных нумароў. Аднак на сённяшнім этапе творчага развіцця калектыву гэта не патрэбна, бо яго праграмы і без таго досыць самадастатковыя. Акрамя таго, рух на сцэне значна абмяжоўваецца вялікай колькасцю інструментаў і гукаўзмацняльнай апаратуры.

Другараднае месца на канцэртах займае таксама і сцэнічны касцюм (калі не ўлічваць досыць арыгінальны і яркі сцэнічны воблік І.Кірчука). Калектыў не робіць на ім акцэнт, бо лічыць, што значна больш увагу гледача прыцягвае наяўнасць на сцэне вялікай колькасці самых розных музычных інструментаў. У якасці афармлення сцэны калі-нікалі можна ўбачыць аўтэнтычныя прадметы побыту (напрыклад, ручнікі). Досыць арыгінальным, на наш погляд, з'яўляецца выкарыстанне на канцэртах слайдаў з фотаздымкамі гурту падчас замежных гастрольных тураў, а таксама слайдаў з рознымі выявамі беларускіх народных музычных інструментаў, традыцыйнага адзення і г.д.

У ансамбля ніколі не было жадання распрацоўваць праграмы ў межах адной тэмы (напрыклад, вясельныя ці калядныя песні); яны складаюцца менавіта па блоках. Звычайна перад кампазіцыяй І.Кірчук дае яе кароткае тлумачэнне (былі канцэрты, калі ў гэты час гучала музыка, якая рыхтавала слухача да наступнай песні). А ёсць блокі нумароў, якія ідуць non-stop.

Ансамбль мае некалькі альбомаў: "Троіца", "Журавы" і сольны праект І.Кірчука "Спадчына загінуўшых вёсак". Музычны крытык З.Несцяровіч адзначала, што запісы І.Кірчука ў параўнанні з іншымі работамі "знаходзяцца значна бліжэй да аўтэнтычных узораў за кошт куды больш простага акампанементу, які максімальна набліжаны да народнага"[3]. Альбом увогуле вырашаны ў камерным гучанні. Выкарыстаны шматлікія вакальныя і інструментальныя налажэнні. Трэба адзначыць, што І.Кірчук па-майстэрску валодае як дыяпазонам і тэмбравай палітрай свайго голасу, так і магчымасцямі вялікай колькасці музычных інструментаў (на канцэрце ўвесь час ідзе іх змена). А ёсць кампазіцыі, дзе таленавіты музыкант адначасова спявае і іграе на варгане, што сёння ў традыцыйным народным інструментальным выканальніцтве не выкарыстоўваецца.

У заключэнне хочацца выказаць думку, што творчасць этнатрыо "Троіца" можа стаць сродкам выхавання моладзі ў адукацыйным працэсе школ з музычным і эстэтычным ухілам, а таксама на ўроках музыкі і спеваў агульнаадукацыйных школ. Гэта магчыма ажыццявіць, калі:

1) вывучаць праз кампазіцыі ансамбля як эстрадныя, так і традыцыйныя музычныя інструменты Беларусі і іншых краін;

2) знаёміць вучняў пры дапамозе твораў калектыву з сучаснымі музычнымі формамі (рок, блюз, джаз, кантры, рок-н-рол і інш.);

3) выкарыстоўваць музычны матэрыял гурту ў якасці ілюстрацый пры вывучэнні традыцыйных беларускіх абрадаў (Каляды, Русальны тыдзень, Купалле і інш.);

4) прапаноўваць вучням малодшых і сярэдніх класаў рытмічныя практыкаванні і музіцыраванне на простых у авалоданні ўдарных і духавых інструментах у спалучэнні з музычнымі кампазіцыямі "Троіцы";

5) выкарыстоўваць запісы калектыву ў якасці музычнага суправаджэння для сучасных харэаграфічных пастановак.

Творчасць гурту можа стаць падставай для стварэння ў межах пазашкольнай дзейнасці ансамбляў такога стылістычнага напрамку, як "Троіца".

Этнатрыо "Троіца" робіць вельмі значную для беларускага грамадства справу. Дзякуючы такім калектывам наша традыцыйная музычная культура прызнана за мяжой як сусветнае мастацтва, іх творчасць павялічыла цікавасць да айчыннай музычнай спадчыны беларускіх слухачоў, сярод якіх значную колькасць складае моладзь. Як падкрэслівае фалькларыст Т.Песнякевіч, "Троіца" далучае да музычнай даўніны новыя пакаленні слухачоў, імкнучыся "размаўляць" з імі на мове, зразумелай маладым, і разам з тым далікатна і паважліва развівае старыя традыцыі"[4]. Менавіта такая музыка можа стаць адным са сродкаў фарміравання добрага музычнага густу і багатага слухацкага вопыту падрастаючага пакалення.

[1] Мухавец Дз. "Троіца" // Мастацтва. 1999. №3. С.51.

[2] Конен В.Д. Пути американской музыки: Очерки по истории музыкальной культуры США. М., 1977. С. 388.

[3] Несцяровіч З. "Спадчына загінуўшых вёсак" // Мастацтва. 2001. №4. С.49—50.

[4] Песнякевіч Т. Слава нашай "Троіцы" ляціць ... да Беларусі? // Літаратура і мастацтва. 1998, 21 жніўня. С.11.

**Музычныя зборнікі:**

1. "Журавы". Этнатрыо "Троіца". PAN Records cccd-00005. (p) 2001. Па ліцэнзіі галандскай фірмы "PAN Records". Запіс студыі "Sing Sing Studio", 2001.
2. "Спадчына загінуўшых вёсак". Іван Кірчук. West Records. CD. (p) 2003. Запіс студыі "Duton". Нідэрланды, 1999.
3. "Троіца". Фолк-трыо "Троіца". PAN Records PAN 171CD. (p) 1998 / Прадзюсер "Троіца". Запіс "ART Studio", Мазыр, "Mezzo Forte", Мінск, 1996—1997.

# Развитие навыков творческого музицирования у студентов



**ПОЛИВОДА Валентина Викторовна** – старший преподаватель, заведующая секцией концертмейстерского класса кафедры фортепиано музыкально-педагогического факультета БГПУ им. Максима Танка

Для успешного осуществления профессиональной деятельности учителя музыки особенно важное значение имеет навык свободного музицирования на музыкальном инструменте. Кроме разучивания и исполнения музыкальных пьес по нотам учитель должен обладать умениями и навыками творческого музицирования, без которого невозможно полноценное эстетическое воспитание школьников. Исходя из этого, особое внимание в процессе подготовки будущего учителя музыки на занятиях по концертмейстерскому классу уделяется формированию навыков и умений игры по слуху — одной из начальных форм творческого музицирования. Умение сыграть без нот на уроке или во время внеклассной работы значительно расширяет профессиональные возможности учителя. Быстро реагируя на появляющийся репертуар (мелодии и песни, которые вчера звучали по телевидению), учитель укрепляет в сознании школьников представление о связи музыки с жизнью, воздействует на их эмоции и чувства.

Кроме того, отбирая для исполнения лучшее из услышанного, он формирует вкусы своих учеников, давая ясную и обоснованную оценку конкретному музыкальному явлению. **Умение играть по слуху вызывает доверие к учителю как к музыканту, поднимает его авторитет.** Вместе с тем педагог, играющий по нотам пьесы классического репертуара и не умеющий сыграть простую песню без нот, может вызвать у детей лишь недоумение. Раз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ